# *ИСТОРИЯ*

**УДК 94(476.5)**

## РОЛЯ ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ У ПАЛІТЫЧНЫМ РАЗВІЦЦІ ПОЛАЦКАЙ ЗЯМЛІ Ў XII ст.

***М.П. КРУПСКІ***
***(Прадстаўлена: д-р гіст. навук, праф. Д.В. ДУК)***

*На аснове археалагічных знаходак у выглядзе асабістай пячаткі падкрэсліваецца значная роля Прападобнай у жыцці не толькі культурнага асяроддзя Полацка, але і яе міжнародны палітычны ўплыў на ход гістарычных падзей XII ст.*

Старажытнарускія князі часта перапісваліся адзін з адным у пісьмовай форме. Гэта былі альбо граматы з бярасты, альбо граматы на пергамене, змацаваныя княжацкай пячаткай, падвешанай да дакумента. Берасцяныя граматы пачытанні большай часткай выбрасваліся, і іх знаходзяць у культурным пласце некаторых гарадоў археолагі (у Ноўгарадзе, Пскове, у нашых землях – у Віцебску і Мсціславе). На пергамене дакументы да нас даходзяць рэдка – пергамен вельмі шанаваўся і напісанае на ім змывалі і выкарыстоўвалі зноў, а пячаткі са свінца адрывалі і выкідвалі і зараз менавіта па іх мы даведваемся пра існаванне старажытнага дакумента на пергамене [1, с. 58].

У XII–XIII стагоддзях склалася асаблівае становішча полацкай дзяржаўнай улады. С.В. Тарасаў звяртае ўвагу, што першыя вядомыя дамовы Полацка з Рыгаю і Гоцкім берагам, як і наступныя са Смаленскам, заключаліся ад імя Святой Сафіі. Натуральна, меўся на ўвазе не сам Сафійскі сабор, але інстытут полацкага епіскапату, і можа нават шырэй – усяго хрысціянскага кліру, ці зусім шырока – ад усіх хрысціян Полацка. Такім чынам, С.В. Тарасаў падкрэслівае надзвычай высокі статус менавіта царкоўнай арганізацыі Полацка, якая, на прыкладах дамоваў, лічылася больш высокаю палітычна, чым нават княжацкая ўлада [2, с. 88].

XI стагоддзе адзначаецца стабільнасць княжацкай улады. На працягу ўсяго стагоддзя, летапісы ведаюць только двух князёў, бацьку і сына, Брачыслава Ізяславіча (1001–1044 гг.) і Усяслава Брачыславіча (1044–1101 гг.). Для XII ст. характэрна частая змена князёў, якая залежала ад розных на тое прычын. Гэта значыць что магутнай свецкай улады на Полацкай зямле ўжо не было. У XII ст. полацкія епіскапы безумоўна пастаўляліся кіеўскім мітрапалітам. І таму іх нельга было разглядаць як незалежную сілу, якая стаяла амаль што вышэй палітычных інтарэсаў таго, ці іншага акружэння князя, які займаў полацкі стол на той момант. Менавіта на такіх прынцыпах і асноўваецца хрысціянская вера. Таму, цалкам нармальным лічыць, што калі ў горадзе, а маецца на ўвазе ўся Полацкая зямля, адсутнічала стабільная палітычная ўлада, яе браў на сябе вышэйшы прадстаўнік кліру.

Для тлумачэння ролі Еўфрасінні Полацкай у гэтым пытанні трэба зрабіць статыстычны аналіз, які прывёў С.В. Тарасаў, і пабачым, што цягам гадоў крыніцы проста не згадваюць полацкіх епіскапаў. Самае простае і лагічнае дапусціць, што іх не ведалі, а таму і не ўпісвалі ў крыніцы. Аднак таксама можна дапусціць, што іх і не было. Сярод епіскапаў менавіта гэтага перыяду вядомы Нікіфар, пастаўлены ў Полацк, а ў 1096 г. прызначаны князем (цікавы факт!) мітрапалітам кіеўскім. Памёр у 1121 г. Ён прызначыў у Полацк Міну ў 1105 г. Памёр Міна ў 1116-м. Наступны, Кузьма (розныя крыніцы падаюць і рознае напісанне імя епіскапа з варыянтамі Кузьма і Казьма, прыйдем да больш прыемлемага напісання у выглядзе Кузьмы), з’явіўся толькі ў 1143 г. [3, с. 278] (у 1157-м згадваецца Кузьма епіскап Галіцкі [4, с. 58]), калі быў пастаўлены на кафедру і яшчэ раз пад 1165 г. Не выключана, што Кузьма, згаданы ў 1143–1156 гг. як полацкі епіскап, і Кузьма Галіцкі – адна асоба і кіраваў паствою ў Полацку па 1147 г. Потым быў выдалены і праз некаторы час зноў з’явіўся ў Полацку. Наступны, Дыянісій, быў рукапакладзены ў 1156 (1166) і памёр у 1182 (1183) г. [2, с. 89].

Такім чынам, атрымоўваецца, што ў 1116–1143 гг. і потым некаторы час паміж 1143 і 1156 гг. ў Полацку не было епіскапаў. Трэба нагадаць, што калі абапірацца на храналогію жыцця Еўфрасінні, то ў 1116 годзе ёй было 12 год, а ў 1143-м адпаведна 39 год. Звернем увагу яшчэ на адну храналагічную акалічнасць. Менавіта на час адсутнасці ў Полацку епіскапаў прыпадае выгнанне полацкіх князёў у Візантыю – 1129–1140-я гг. [2, с. 89]. У 1132-м г. на Полацкае княжанне быў запрошаны Васілька Святаславіч (1132–1143), які нейкім чынам пазбегнуў выгнання. Тым больш Жыціе самой Еўфрасінні

кажа пра тое, што разам з ігуменняй ў манастыры жылі і маліліся яе сёстры – Еўдакія і Еўпраксія [5, с. 4–5]. Дадзены выпадак можна растлумачыць тым, што Васілька з'яўляўся родным братам Еўфрасінні Полацкай [1, с. 58; 2, с. 88; 6, с. 32–33]. На гэты конт С.В. Тарасаў адзначае, што ў 1133-м Васілька Святаславіч вярнуўся з выгнання з Візантыі [2, с. 89]. Але чаму менавіта ён? І чаму не вярнуліся астатнія? Магчыма Прэпадобнай удалось схаваць роднага брата, а затым паспрыяць аднаўленню ўлады законных уладароў Полацкай зямлі. Але гэта толькі адна з магчымых версій. Гэты факт у некаторай гіпатэтычнай ступені можна тлумачыць і тым, што полацкі епіскап як духоўнік полацкага князя і ўсяго радаводу таксама падзяліў з імі ўсе цяжкасці выгнання. У час адсутнасці епіскапа паміж 1143–1156 гг. Еўфрасінні адпаведна было 39–52 гг. [2, с. 89].

Палітычная роля Еўфрасінні і яе ўплыў на тэрыторыі Полацкай зямлі і ў цэлым Усходняй Еўропы ў гістарыяграфіі шырока асветлены, нават узнікла навуковая палеміка аб так званым "полацкім матрыярхаце" [7; 8].

Натуральна, наяўнасць асабістай пячаткі ў Еўфрасінні Полацкай не выклікала сумненняў, улічваючы яе значны ўплыў на палітычнае і рэлігійнае жыццё Полацкай зямлі ў другой трэці XII ст. Па трапным вызначэнні расійскага гісторыка Л.В. Аляксеева, Еўфрасіння, насуперак рускай традыцыі і дзякуючы прамым кантактам з Візантыяй, у прыватнасці з канстанцінопальскім патрыярхам Лукой Хрызавергам, адчувала сабе ўпэўнена і незалежна і пры патрэбе, як і яе родзічы-князі, рассылала ў розныя ўсходнеславянскія гарады і, верагодна, у Царград, важныя дакументы, замацаваныя асабістай пячаткай [1, с. 59]. Тым не менш да сённяшняга дня знаходак дакладна вызначаных (атрыбутаваных) пячатак Еўфрасінні Полацкай не было, за выключэннем аднаго артэфакта [9, с. 14].

У 1968 г. патранессы Еўфрасіні – Еўфрасінні Александрыйскай, на Гарадзішчы каля Ноўгарада В.Л. Яніным была знойдзена пячатка з выявай іконаграфічнай кампазіцыі "Праабражэнне" і малітоўным надпісам [10; 1, с. 58]. Выява на згаданай пячатцы была наступная: з аднаго боку прадстаўлена шматфігурная кампазіцыя – "Праабражэнне Гасподне на гары Фавор". У цэнтры – выява Ісуса Хрыста, па абодва бакі – пракорі Ілля і Маісей, пад імі – тры апосталы: Пётр, Іакаў і Іаан, якія ў жаху "пали на лица свои" ("Евангелле ад Матфея"). Выява суправаджаецца радковай легендай: МЕТА(МОР)Ф(ОСИ)С" – "Праабражэнне". З адваротнага боку змешчана паясная выява святой, па абодва бакі якой – радковая легенда: "Иефросиня" – "Іефрасіня", а па краі пячаткі ідзе колавая легенда, якая ўяўляе сабой малітоўнае прашэнне:"Ги помози рабе своеи Ефросини нареченнои" ("Госпадзі, жапамажы рабе сваёй, Еўфрасінні нарачонай") [9, с. 14].

Пячатка ўпершыню была апублікаваная расійскім гісторыкам і археолагам В.Л. Яніным і атрыбутаваная як прыналежная Еўфрасінні Полацкай на падставе наступных аргументаў. Па-першае, полацкая княжна Прадслава атрымала імя Еўфрасіння пры пастрыжэнні ў манахіні, а не пры хрышчэнні, і на гэта ёсць указанне ў слове "нарачонай". Па-другое, фармальныя прыкметы пячаткі (памеры і наяўнасць добрапажадальнага надпісу) дазволілі датаваць яе XII ст., а самай вядомай на Русі жанчынай, якая насіла ў гэты час такое імя, з'ўлялася Еўфрасіння Полацкая. Па-трэцяе, назва Спаса-Праабражэнскай царквы, пабудаванай Еўфрасінняй, і манастыра ў гонар Спаса выклікалі паралелі з выявай "Праабражэння" на пячатцы. Да таго ж, на думку В.Л. Яніна, у тагачасным Полацку існавала ўнікальная з'ява, вядомая пад назвай "полацкі матрыярхат", калі жонкі полацкіх князёў высланых у Візантыю Мсціславам Уладзіміравічам, замяшчалі ў палітычным жыцці сваіх мужоў [4, с. 231–232].

У 2011 г. расійскі гісторык А.В. Маёраў апублікаваў артыкул, у якім прывёў аргументы, што дазволілі яму ідэнтыфікаваць вышэйзгаданы сфрагістычны помнік як пячатку Еўфрасінні Галіцкай і датаваць яго першай паловай – сярэдзінай другога дзесяцігоддзя XIII ст. Па-першае, ён адзначае, што царква і манастыр, заснаваныя Еўфрасінняй Полацкай, не называліся менавіта ў гонар Праабражэння, у гістарычных дакументах да XVI ст. і пазней яны называліся Спасаўскімі. На карысць гэтага сведчаць і фрэскі ў Спасаўскай царкве, сярод якіх не выяўлена сцэна "Праабражэння". Па-другое, напісанне імя на пячатцыі крыжы Еўфрасінні Полацкай адрозніваюцца. На пячатцы яно запісана "Иефросіня" ("Ефросиня"). А вось на крыжы сустракаецца імя "Офросинья". Праяўленне ў гэты час вышэйзгаданага "полацкага матрыярхата" таксама выклікае ў даследчыка сумненні: на гэты перыяд якраз прыходзіцца княжанне полацкага князя Васількі, брата Еўфрасінні Полацкай. Такім чынам, аргументы, прыведзеныя А.В. Маёравым, даказваюць прыналежнасць гэтай пячаткі Еўфрасінні Галіцкай [11, с. 5–25].

Перад тым як перайсці да атрыбуцыі знаходкі 2015 г., неабходна коратка спыніцца на гісторыі падобных пячатак. Адзначым, што практыка замацавання легітымнасці афіцыйных дакументаў металічнымі, як правіла, свінцовымі віслымі пячаткамі была запазычаная з Візантыі ў канцы X ст. Пячаткамі замацоўвалі важнейшыя дакументы. Сам дакумент уяўляў сабой скрутак пергамента, перавіты шнурам, які апламбіроўваўся свінцовай пячаткай. Пячатка сведчыла аб сапраўднасці дакумента,

абараняла яго ад дадатковых несанкцыянаваных прыпісак і пацвярджала асобу ўладальніка. Адзначым, што да сярэдзіны 2012 г. было зарэгістравана каля 8500 старажытнарускіх пячатак X–XV стст. (пераважна свнцовых), з якіх навукова апрацавана і апублікавана больш за 3700 [9, с. 13].

Права пасведчання дакументаў на Русі належала толькі вышэйшай свецкай ці царкоўнай уладзе – князям, мітрапалітам, епіскапам, пасаднікам. Калі прадстаўнік улады паміраў ці сыходзіў з палітычнай арэны, жалезны інструмент для вырабу пячаткі (булатырый – спецыяльныя клешчы з выразанымі на іх выявамі і надпісямі – знішчаўся, каб пазбегнуць фальсіфікацый (з гэтай прычыны знаходкі жалезных булатырыяў выключна рэдкія) [9, с. 13–14].

Падчас раскопак на тэрыторыі Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра ў Полацку ў 1998 г. была знойдзена віслая свінцовая пячатка з надпісам "+ ГН ПОМОЗИ РА \ Б \ Е СВО…" на рэверсе і нагруднай выявай Хрыста-Спаса з надпісам па баках "IC XC" на аверсе. Аналіз сімволікі гэтай пячаткі ў гістарычным кантэксце дазволіў беларускаму гісторыку Сяргею Тарасаву прыйсці да высновы, што яна не толькі належыць Еўфрасінні Полацкай, але і з'яўляецца своеасаблівай епіскапскай пячаткай. Якой княгіня карысталася ў час адсутнасці епіскапа ў Полацку паміж 1143–1156 гг. Фактычна галоўным аргументам на карысць пераняцця Еўфрасінняй "функцый" уладыкі стала размяшчэнне на гэтай, несумненна жаночай, пячатцы выявы "Спаса" [12, с. 43].

У маі 2015 г. на тэрыторыі Спаса-Еўфрасіннеeўскага манастыра ў Полацку выкладчыкамі і студэнтамі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта пад кіраўніцтвам доктара гістарычных навук Д.У. Дука праводзіліся археалагічныя раскопкі. Вывучаліся падмуркі Спаса-Праабражэнскай царквы і тэрыторыя каля храма. Сярод знаходак з крыпты адну з поўным правам можна назваць унікальнай. Гэта свінцовая актавая пячатка (була) з іконаграфічнай выявай Ісуса Хрыста і надпісам "Ги помози рабе соеи Офросинии" – "Госпадзі, дапамажы рабе сваёй Еўфрасінні" (мал. 1). Наяўнасць на пячатцы надпісу з імем, тоесным імені заснавальніцы манастыра, прападобнай Еўфрасінні Полацкай, адразу паставіла пытанне аб дакладнай яе атрыбуцыі [9, с. 13].




Мал. 1. Пячатка Еўфрасінні Полацкай, знойдзеная ў маі 2015 г. Крыніца [9, с. 15].

Д.У. Дук разам з калектывам аўтараў апублікаваў артыкул, у якім звярнуўся да атрыбуцыі пячаткі, знойдзеннай пры археалагічных раскопках на тэрыторыі Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра ў Полацку ў 2015 г. Пячатка мае круглую форму і наступныя памеры: вышыня 2,4 см, шырыня 2,5 см. З аднаго боку на ёй змешчаная выява Іісуса Хрыста, якая ў іканаграфіі мае назву "Спас Усеўладны" – "Пантакратар". Іісус апрануты ў гімацій і хітон і паказаны з прамымі валасамі, адзначанымі чатырма хвалістымі лініямі, на лоб спускаецца невялікая пасма валасоў, у яго невялікія вусы і кароткая барада, паказаная перарывістай лініяй. Добра відаць вочы, выяўленыя круглымі кропкамі, і даволі шырокі нос. Левая рука падтрымлівае закрытую кнігу – Евангелле, там, дзе павінна знаходзіцца правая рука, выява пашкоджаная. Німб над галавой паказаны не роўнай, а перавітай лініяй. Акрамя таго, гэта хросны німб, ён абрысаваны за галавой Іісуса прамымі лініямі, аднак унутры змешчаны не літары "WON" – "Існы", а проста кропкі. Па абодва бакі ад постаці надпіс "IC XC" – "Іісус Хрыстос". Выява выдзелена кругавой лініяй [9, с. 15].

На адваротным баку пячаткі змешчаны надпіс: "Ги помози рабе своеи Офросинии" ("Госпадзі, дапамажы рабе сваёй Еўфрасінні"). Надпіс пачынаецца знакам крыжа, а заканчваецца чатырма кропкамі, ён, як і выява, выдзелены кругавой лініяй [9, с. 15].

Падчас работ, звязаных з рэстаўрацыяй знаходкі, было высветлена, што ў фондах Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка захоўваецца яшчэ адна свінцовая пячатка з аналагічным адбіткам. Яна была знойдзена падчас раскопак пад кіраўніцтвам беларускага археолага С.В. Тарасава на тэрыторыі Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра ў 1998 г. і змяшчае толькі частку надпісу-звароту, без пазначэння імя: "Ги помози рабе своеи" ("Госпадзі, дапамажы рабе сваёй…"). Адзначым, што адсутнасць часткі надпісу тлумачыцца тым, што адбітак матрыцы (булатырыя) быў змешчаны і яна не адбілася на свінцовым дыску пячаткі. Пры накладанні адбіткаў выяў абодвух пячатак адзін на адзін высвятляецца поўная ідэнтычнасць захаванай часткі выяў [9, с. 15–16].

Пры атрыбуцыі гэтых полацкіх пячатак Д.У. Дук звярнуўся да палажэнняў, якія прапанаваў А.В. Маёраў [9, с. 16–17]. На аснове гэтых дадзеных, пячатку, знойдзенную каля Спаса-Праабражэнскай царквы, можна ідэнтыфікаваць як асабістую пячатку Прападобнай Еўфрасінні Полацкай на падставе выявы на ёй святога Спаса – у гонар якога першапачаткова быў асвечаны манастыр, а таксама па палеаграфічных даных – выкарыстанне ў форме напісання імя "Офросіння". Яшчэ адным вызначальным фактарам у атрыбуцыі пячаткі з'яўляецца факт яе знаходжання ў запаўненні крыпты Спаса-Праабражэнскай царквы, пабудаванай пад патранатам і па замове Еўфрасінні Полацкай [9, с. 17].

Трэба звярнуць увагу на факт наяўнасці дзвюх аднолькавых пячатак – з раскопак 1998 і 2015 гг. на тэрыторыі Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра. Паходжанне знаходак сведчыць, што Еўфрасіння Полацкая замацоўвала дакументы сваёй уласнай пячаткай непасрэдна на тэрыторыі манастыра, а сам манастыр з'яўлялся месцам актыўнага абарачэння актавых дакументаў. Змест гэтых дакументаў мог быць самым разнастайным – ад палітычнага да культурна-асветніцкага. Заўважым, што надзвычай актуальным пытаннем для Еўфрасінні Полацкай з'яўлялася папаўненне бібліятэкі манастыра. Сёння на падставе аналізу сюжэтаў фрэскавага роспісу Спаса-Праабражэнскай царквы даследчыкі зрабілі выснову, што Еўфрасіння карысталася шматлікімі і разнастайнымі кніжнымі крыніцамі з уласнай бібліятэкі, крыніцай паступлення якіх з'яўляліся Візантыя і Рым. Відавочна, што праца па зборы гэтай бібліятэкі не магла абыходзіцца без актыўнай перапіскі, матэрыяльным сведчаннем якой з'яўляецца знойдзенная ў Полацку актавая пячатка Еўфрасінні Полацкай [9, с. 17].

Несумненна трэба з павагай паставіцца да здзіўлення В.Л. Яніна аб так званым "полацкім матрыярхаце", што у сваю чаргу выклікала навуковую палеміку. Але на самой справе спецыфіка сістэмы кіравання Полацкай зямлі на працягу IX–XIII стст. ведае не адзіны такі прыклад. Дастаткова ўзгадаць сітуацыю з княжной Рагнедай, якая засталася адзінай прадстаўніцай княжаскага роду Рагвалодавічаў, у сувязі з фізічным знішчэннем прадстаўнікоў княжаскага роду па мужской лініі Уладімірам Кіеўскім. Пры гэтым агульнавядомым фактам з'яўляецца тое, што пры адсутнасці, а ў дадзеным выпадку знішчэнню, мужчын, якім перадавалася княжацкая ўлада. Гэтыя функцыі пераходзяць да прадстаўнікоў жаночага полу. У дадзеным выпадку да Рагнеды. У сваю чаргу, якая нарадзіла Ізяслава. Уладзімір быў вымушаны перадаць спадчынны велікакняскі стол законнаму ўладальніку.

Другі прыклад назіраем у XIII ст. Калі пры наяўнасці законнага полацкага князя Уладзіміра Полацкага. На палітычнае жыццё аказвала свой уплыў яго жонка Святохна. Трэба падкрэсліць, што і першы і другі прыклад зафіксаваны летапісамі і з'яўляюцца бясспрэчным фактам. Таму ўплыў Еўфрасінні Полацкай на палітычныя справы Полацкай дзяржавы цалкам адпавядаюць ходам гісторыя XII ст.

ЛІТАРАТУРА

1. Алексеев, Л.В. Западные земли домонгольской Руси: очерки истории, археологии, культуры : в 2 кн. / Л.В. Алексеев ; Ин-т археологии РАН. – М. : Наука, 2006. – Кн. 2. – 167 с.
2. Тарасаў, С.В. "Белыя плямы" Полацкай археалогіі і гісторыі. Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых даследванняў (да 80-годдзя пачатку археалагічных раскопа у г. Полацку) : зб. навук. прац рэсп. навук.-практ. семінара, Полацк, 20–21 ліст. 2008 г. / пад агульн. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача. – Наваполацк : ПДУ, 2009. – 300 с.
3. Татищевъ В.Н. Исторія Россійская съ самыхъ древнейшихъ временъ неусыпными трудами черезъ тритцать лътъ собранная и описанная покойнымъ тайнымъ совътникомъ и Астраханскимъ губернаторомъ Васильемъ Никитичемъ Татищевымъ. Книга вторая. Напечатана при Императорскомъ университетъ, 1773 г. – 536 с.
4. Янин, В.Л. Актовые печати Древней Руси X–XV вв. / В.Л. Янин, П.Г. Гайдуков. – М. : Наука, 1970. – Т. 1 : Печати X – начала XII вв. – 504 с.
5. Дивен бог во святых своих. Преподобная Евфросиния Полоцкая: житие, современные чудеса. – Полоцк, 2010. – 71 с. : ил.
6. Арлоў, У.А. Нарадзілася Эўфрасіньня Полацкая, асьветніца і нябесная заступніца Беларусі. Мысліцелі і асветнікі Беларусі : энцыкл. даведнік / Беларус. энцыкл. ; гал. рэд.: Б.І. Сачанка [і інш.] ; маст. Э.Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 1995. – 671 с. : іл.
7. Пушкарева, Н.Л. Женщины Древней Руси [Электронный ресурс] / Н.Л. Пушкарева // Библиотекарь.Ру. – Режим доступа: http://bibliotekar.ru/polk-11/25.htm. – Дата доступу: 01.03.2011.
8. Тарасов С.В. Женское начало белорусской истории [Электронный ресурс] / С.В. Тарасов. Экспертное сообщество Беларуси. Наше мнение. – Режим доступа: http://nmnby.eu/news/express/886.html. – Дата доступу: 21.02.2012.
9. Дук, Д.У. Пячатка Еўфрасінні Полацкай / Д. Дук, І. Калечыц, А. Коц // Беларускі гістарычны часопіс. – 2015. – № 7. – С. 13–18.
10. Янин, В.Л. Полоцкий матриархат / В.Л. Янин // Знание-сила. – 1970. – № 12.
11. Майоров, А.В. Печать Евфросинии Галицкой из Новгорода // Древняя русь: вопросы медиевистики. – 2011. – № 2 (44). – С. 5–25.
12. Галубовіч, В.У. Miscellanea historica polocensia = Даследаванні па гісторыі Полаччыны XII–XVII стст. : манагр. / В.У. Галубовіч. – Гродна : ГДАЎ, 2014. – 224.